*3.* 陈平：《代谢增长论——技术小波和文明复兴》，北京大学出版社，北京，2019，69-72页 = Чэнь Пин. Теория метаболического роста / Чэнь Пин // Технологические вейвлеты и возрождение цивилизации. – Пекин, 2019. – С. 69–72.

*4.* 陈平：《代谢增长论——技术小波和文明复兴》，北京大学出版社，北京，2019，25–26页 = Чэнь Пин. Теория метаболического роста / Чэнь Пин // Технологические вейвлеты и возрождение цивилизации. – Пекин, 2019. – С. 25–26.

УДК 005.336.5:069.157–057.8

# МАЙСТЭРСТВА ЭКСКУРСАВОДА: ПРАФЕСІЙНЫЯ КАМПЕТЭНЦЫІ І АСАБІСТЫЯ ЯКАСЦІ

***І. Г. Лупашка,*** *кандыдат культуралогіі, дацэнт, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны ўстановы адукацыі «Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў»*

**Анатацыя.** У артыкуле разгледжана праблема майстэрства экскурсавода, вылучаны яе асноўныя складнікі: прафесійныя кампетэнцыі і асабістыя якасці. Праведзены кароткі гістарычны агляд на падставе аналізу спецыялізаваных музейных часопісаў («Русский экскурсант», «Экскурсионный вестник», «Экскурсионное дело», «Советский музей» і інш.) і літаратуры. Разгледжаны пытанні падрыхтоўкі, павышэння кваліфікацыі і атэстацыі экскурсаводаў у Беларусі на сучасным этапе.

**Ключавыя словы:** экскурсавод, экскурсія, прафесійныя кампетэнцыі, асабістыя якасці экскурсавода, майстэрства экскурсавода, музей, гід-перакладчык, падрыхтоўка экскурсаводаў.

# GUIDE MASTERY: PROFESSIONAL COMPETENCE AND PERSONAL QUALITIES

***I. Lupashko,*** *PhD in Cultural Studies, Associate Professor, Associate Professor of Historical and Cultural Heritage Department, Educational Institution «Belarusian State University of Culture and Arts»*

**Abstract.** The article examines the problem of the tour guide's skill, highlights its main components: professional competences and personal qualities. The author provides a brief historical overview based on the analysis of specialized museum magazines («Russian Excursionist», «Excursion Journal», «Excursion Work», «Soviet Museum», etc.) and literature. The article considers issues of training, qualification improvement and certification of tour guides in Belarus at the current stage.

**Keywords:** guide, excursion, professional competence, personal qualities of a guide, mastery of a guide, museum, guide-interpreter, guide training.

Пераважная большасць людзей хоць раз у жыцці наведвала музейную ці пазамузейную экскурсію. Якія эмоцыі яны вынеслі з гэтага мерапрыемства ў значнай ступені залежыць ад экскурсавода.

Нягледзячы на тое, што агульнапрынята называць любога спецыяліста, які праводзіць экскурсію, экскурсаводам, існуюць тэрміналагічныя нюансы. Звернемся да трактавання паняцця ў заканадаўстве. У Законе Рэспублікі Беларусь «Аб турызме» паняцце «экскурсавод» вызначаецца наступным чынам: «фізічная асоба, якая валодае ведамі і прафесійнымі навыкамі, неабходнымі для правядзення экскурсій на беларускай ці рускай мове». «Фізічная асоба, якая вольна валодае замежнай мовай (мовамі) і валодае ведамі і прафесійнымі навыкамі, неабходнымі для правядзення экскурсій на замежнай мове» называецца гідам-перакладчыкам [4]. Гэтыя ж пасады зафіксаваны ў Адзіным класіфікацыйным даведніку пасад служачых, занятых у галіне турызму [1].

У Беларусі музейная дзейнасць рэгулюецца Кодэксам аб культуры. Згодна з ім экскурсійнае абслугоўванне наведвальнікаў музея з'яўляецца адным з кірункаў музейнай дзейнасці і ажыццяўляецца музейнымі работнікамі [3]. У адпаведнасці з Адзіным класіфікацыйным даведнікам пасад служачых, занятых у культуры і мастацтве, экскурсіі ў музеях могуць праводзіць як работнікі, якія працуюць на пасадах навуковых супрацоўнікаў (у т. л. малодшых, старшых і вядучых), так і на пасадах лектараў (экскурсаводаў) [1]. У беларускай практыцы склалася, што ў музеях пераважаюць штатныя адзінкі навуковых супрацоўнікаў.

Аднак, улічваючы, што выяўленне юрыдычных нюансаў не з'яўляецца мэтай дадзенага даследавання, у артыкуле выкарыстоўваецца паняцце «экскурсавод» у дачыненні да ўсіх спецыялістаў, якія праводзяць экскурсіі ў музеях і сферы турызму.

Развіццё экскурсійнай справы на тэрыторыі Беларусі адбывалася ў рамках аналагічных працэсаў у Расійскай імперыі, а затым СССР. Пытанні прафесійных кампетэнцый экскурсавода (у азначаны перыяд шырэй выкарыстоўвалася назва «кіраўнік экскурсіі») узнімаліся яшчэ на пачатку XX ст. у рамках актыўнага выкарыстання экскурсійнага метада выкладанння, а затым пашырыліся ў 1920-я гг., калі адбываўся ўздым экскурсійнай справы ў турызме (ва ўзаемадзеянні з краязнаўчым рухам), а ў музеях назіраўся працэс актыўнага фарміравання кірунку экскурсійнага абслугоўвання і камунікацыі з наведвальнікамі.

У гэты перыяд выходзілі спецыялізаваныя перыядычныя выданні «Русский экскурсант», «Экскурсионное дело», «Экскурсионный вестник», праведзены дзве экскурсійный канферэнцыі, стваралiся экскурсійныя базы, а таксама прадпрыняты спробы стварэння спецыялізаваных навукова-даследчых інстытутаў – Петраградскага (Ленінградскага) экскурсійнага інстытута і Цэнтральнага музейна-экскурсійнага інстытута

ў Маскве [7]. Зразумела, што паўставалі пытанні падрыхтоўкі і прафесіяналізму спецыялістаў.

У 1930-я гг. кадравыя пытанні рэгулярна абмяркоўваліся на старонках спецыялізаванага часопіса «Советский музей» [5; 6]. Адзін з артыкулаў прысвечаны непасрэдна «экскурсоводческим кадрам» і іх кваліфікацыі [5]. З дадзенага артыкула вынікае, што існавала асэнсаванне значнай ролі экскурсавода ў музеі, які разглядаўся як пасрэднік паміж наведвальнікам і экспазіцыяй. Сярод асноўных недахопаў у майстэрстве экскурсавода вылучаюцца наступныя: «гидизм» – дэманстрацыя групе асобных экспанатаў (рарытэтаў) безадносна тэмы і плана, метадычна не арганізавана; «вещевизм» – паказ рэчаў саміх па сабе, без раскрыцця зместу той ці іншай праблемы, адлюстраванай у экспазіцыі, з іх дапамогай; «экскурсионный штамп» – правядзенне вывучаннай экскурсіі без уліку спецыфікі экскурсійнай аўдыторыі; лекцыйнасць – неўменне узаемазвязаць аповед з паказам [5, с. 52–53].

Калі наконт асобных «недахопаў» магчыма дыскусія, то пры абстрагіраванні ад сацыяльна-палітычнай афарбоўкі, адпаведнай разглядаемаму часу, патрабаванні і прыкметы прафесіяналізма экскурсавода, вызначаныя ў артыкуле Раманоўскай, з’яўляюцца слушнымі і сёння. Сярод іх: валоданне фактычным матэрыялам, звязаным з экскурсійным аб’ектам; раскрыццё тэмы экскурсіі ў адпаведнасці з яе асноўнай ідэяй; пабудова зместу экскурсіі на спецыяльна адабраным сістэматызаваным матэрыяле, у лагічнай паслядоўнасці, з выкарыстаннем разнастайных прыёмаў яго спалучэння; змест экскурсіі павінен адпавядаць сучасным навуковым дадзеным; у працэсе правядзення экскурсіі робяцца абагульняючыя высновы па асноўных пытаннях; экскурсавод знаёміцца з групай і ўлічвае яе ўзровень, спецыяльныя інтарэсы і заданне (мэта наведвання экскурсіі. – *І. Л.*); на пачатку экскурсіі дакладна абазначаюцца яе тэма і задачы; экскурсавод наладжвае кантакт з групай, утрымлівае яе ўвагу, назірае за яе ўспрыняццем, улічваючы рэакцыі наведвальнікаў; маўленне экскурсавода дакладнае, лагічна абаснаванае, вобразнае і яскравае; выкарыстоўваюцца разнастайныя метады паказа; вытрымліваецца хранаметраж экскурсіі («правильное чередование по времени ее отдельных частей»); напрыканцы экскурсіі экскурсавод падводзіць кароткія вынікі.

Звяртаецца ўвага і на асабістыя якасці экскурсавода, якія робяць яго экскурсію адметнай – «дар слова, гумар, драматызацыя» [5, с. 54–55].

З цягам часу і зменай сацыяльна-культурных умоў патрабаванні да прафесійных кампетэнцый экскурсавода зведалі пэўныя трансфармацыі. Сучасныя даследчыкі, акрамя адпаведнай кваліфікацыі, вылучаюць наступныя: высокі ўзровень інтэлекту і агульнай эрудыцыі; лінгвістычныя кампетэнцыі; мульцікультурныя і камунікатыўныя кампетэнцыі; творчыя здольнасці; культура маўлення, веданне асноў псіхалогіі і інш. Сярод неабходных асабістых якасцей называюць

дабразычлівасць, ветлівасць, аптымізм, высокі ўзровень эмацыянальнага інтэлекту, харызматычнасць, псіхалагічная ўраўнаважанасць і стрэсаўстойлівасць [4, с. 164–183]. Гэта стасуецца з «вобразам экскурсавода», створаным студэнтамі спецыяльнасці «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (культурная спадчына і турызм)» БДУКМ падчас выканання творчага задання. Сярод адмоўных якасцей студэнты часцей за ўсё называлі грубасць, некампетэнтнасць, суб'ектыўнасць, манатонны расповед, няўпэўненасць, неахайнасць, дрэнную дыкцыю, адсутнасць пачуцця гумару.

Бясспрэчна, значную ролю ў фарміраванні прафесіяналізма экскурсавода адыгрывае працэс падрыхтоўкі і павышэння кваліфікацыі. Асноўныя спецыяльнасці першай ступені вышэйшай адукацыі, дзе можна атрымаць неабходныя прафесійныя кампетэнцыі, – «турызм і гасціннасць» (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт фізічнай культуры, Брэсцкі дзяржаўны ўніверсітэт ім. А. С. Пушкіна, Гродзенскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Янкі Купалы), «музейная справа і ахова гісторыка-культурнай спадчыны (па накірунках)» (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт, Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт культуры і мастацтваў, Гомельскі дзяржаўны ўніверсітэт ім. Ф. Скарыны) і новая спецыяльнасць «геатэхналогіі турызму і экскурсійная дзейнасць» (Беларускі дзяржаўны ўніверсітэт). Некаторыя ўстановы сярэдняй спецыяльнай адукацыі таксама рыхтуюць спецыялістаў па спецыяльнасці «турызм і гасціннасць» з прысваеннем кваліфікацыі «турагент. Экскурсавод».

Згодна з заканадаўствам Рэспублікі Беларусь для правядзення экскурсій у галіне турызму ўсім спецыялістам неабходна прайсці абавязковую атэстацыю ў Нацыянальным агенцтве па турызму. Там жа можна прайсці курсы падрыхтоўкі экскурсаводаў.

Прафесійная дзейнасць экскурсавода патрабуе пастаяннага павышэння кваліфікацыі. Гэта могуць быць як цэнтралізаваныя і спецыяльна арганізаваныя сістэматычныя мерапрыемствы (курсы, лекцыі, паказальныя і вучэбныя экскурсіі, метадычныя секцыі і інш.), так і самаадукацыя. Слушныя варыянты для самастойнай работы распрацаваны яшчэ ў 1930-я гг. Напрыклад, пасля кожнай праведзенай экскурсіі прапаноўвалася запоўніць «дзённік экскурсавода», аналіз якога «дае багаты фактычны матэрыял для вывучэння профілей музейнага гледача, вывучэння эфектыўнасці экскурсій і эфектыўнасці экспазіцыі дадзенага музея» [5, с. 56]. Пазней гэта форма трансфарміравалася ў «картку праслухоўвання экскурсіі».

Такім чынам, у дадзеным артыкуле зроблена спроба абазначыць вобраз экскурсавода як прафесіянала ў сваёй справе. Асноўныя складнікі майстэрства экскурсавода (прафесійныя кампетэнцыі і асабістыя навыкі) былі вызначаны яшчэ ў 20–30-я гг. ХХ ст., з цягам часу трансфарміраваліся і набывалі запатрабаваныя соцыумам адметныя рысы.

*1.* Единый квалификационный справочник должностей служащих [Электронный ресурс]. Вып. 27 : Должности служащих, занятых в организациях туризма. Вып. 30 : Должности служащих, занятых в культуре и искусстве // Юридич. портал alibi.by. – Режим доступа: https://www.alibi.by/index.php?do=static&page=eksd. – Дата доступа: 01.09.2022.

*2.* Инновации в экскурсионной работе: концепции, технологии, практика : в 2 ч. / О. Е. Афанасьев [и др.]. – М. ; Берлин : Директ-Медиа, 2021. – Ч. 1. – 592 с.

*3.* Кодэкс Рэспублікі Беларусь аб культуры [Электронны рэсурс] : 20 ліп. 2016 г., № 413-З : прыняты Палатай прадстаўнікоў 24 чэрв. 2016 г. : Адобр. Саветам Рэсп. 30 чэрв. 2016 г. // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Рэжым доступу: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=Hk1600413. – Дата доступу: 10.09.2022.

*4.* О туризме [Электронный ресурс] : Закон Респ. Беларусь от 11 нояб. 2021 г. № 129-З : принят Палатой представителей 4 окт. 2021 г. : одобр. Советом Респ. 28 окт. 2021 г. // Нац. правовой интернет-портал Респ. Беларусь. – Режим доступа: https://pravo.by/document/?guid=12551&p0=H12100129&p1=1&p5=0. – Дата доступа: 10.09.2022.

*5. Романовская, Н. В.* О методическом руководстве экскурсоводческими кадрами в музеях / Н. В. Романовская // Совет. музей. – 1936. – № 4. – С. 52–57.

*6. Сент-Илер, К.* Об устройстве курсов для подготовки преподавателей естествоведения к экскурсиям / К. Сент-Илер // Рус. экскурсант. – 1915. – № 1. – С. 5–8.

*7. Смирнова, А. Г.* Из истории отечественной экскурсионной школы: Петроградский (Ленинградский) экскурсионный институт (1921–1924 гг.) / А. Г. Смирнова // Вестн. РГГУ. Серия «Исторические науки. Региональная история. Краеведение». – 2012. – № 6 (86). – С. 58–78.